Залескі: лічбавізацыя павінна паляпшаць эфектыўнасць эканомікі і спрашчаць жыццё людзей

Лічбавізацыя павінна паляпшаць эфектыўнасць нашай эканомікі і спрашчаць жыццё людзей. Важнасць гэтага адзначыў, адказваючы на пытанне карэспандэнта БЕЛТА, Кірыл Залескі, які сёння назначаны міністрам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь.

"Прэзідэнт паставіў задачу максімальна правільна, разумна і акуратна падыходзіць да пытанняў цыфравізацыі ў нашай краіне, – падкрэсліў новы міністр. – Лічбавізацыя не павінна быць дзеля цыфравізацыі. Яна павінна быць для таго, каб паляпшаць эфектыўнасць нашай эканомікі і спрашчаць жыццё нашых грамадзян. Думаю, што на гэтых асноўных напрамках мы павінны будзем сканцэнтраваць свае намаганні".

Кірыл Залескі таксама звярнуў увагу:

"Беларусь сёння валодае вельмі развітым IT-сектарам. Нам трэба паглядзець, у якіх месцах нам трэба ўзмацніць карысць гэтага сектара для вырашэння нейкіх надзённых практычных задач унутры краіны. Адпаведна, у гэтым кантэксце мы і будзем выбудоўваць далейшую работу".

Крыніца: БЕЛТА

Source URL:
https://mpt.gov.by/zaleski-cyfravizacyya-pavinna-palyapshac-efektyunasc-ekanomiki-i-sprashchac-zhyccyo-lyudzey